Газета для вас

13 — 19 красавіка 2001 г.

№ 15 (278)

Грамадска-палітычны штотыднёвік, выдаецца са студзеня 1997 года

ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Мой взгляд на ситуацию в Беларуси

6 апреля в Женеве (столица Швейцарии) на сессии Комиссии ООН по правам человека выступил с речью Владимир Кудинов.

3-я стар.

Дзе ж яны, тыя сто долараў?

У жніўні (сцвярджае ўлада), кожны бюджэтнік будзе атрымліваць зарплату эквівалентную 100, 200, а то і 500 доларам.

4-я стар.

Фермерства — цяжкая праца



Канстанцін Ігнатавіч Шэндзер — жыхар вёскі Пярковічы Драгічынскага раёна. Ён — фермер-землеўладальнік.

5-я стар.

СВЕТЛАЯ ПАСХА



Дорогие братья и сестры!

Воскресение Христово — есть праздник всеобщей радости и ликования. Он называется святыми отцами праздником из праздников и торжеством из торжеств, так как люди даже далёкие от веры не могут равнодушно относиться к нему и, не сознавая величия этого торжества, с чувством приподнятого настроения души встречают его. И это не случайно. Ведь Воскресший Господь воистину открыл для нас всех райские двери, вывел из ада души праведных людей и всех нас сегодня призывает ко спасению.

Мы чувствуем Его Божественную милость, и в дни святой Пасхи ликуют человеческие сердца, и вся земля преисполняется радостью.

В первый год третьего тысячелетия христианства мне хотелось бы всех вас поздравить с благодатным праздником Воскресения Христова, пожелать вам мира, благоустроения вашей жизни и поприветствовать всех вас пасхальным восклицанием:

"Христос Воскресе — Воистину Воскресе".

Настоятель Свято-Петровского храма г. Березы протоиерей Георгий ШЕВЦОВ.

XXX

Дорогие читатели!

В Вербное воскресение отнесли мы в свои дома вербные ветви, которые были освящены для того, чтобы любовь нашего Господа Иисуса Христа всегда была с нами.

Чтобы лучше понять творенье Создателя всего мира, в течение этой недели перед светлым праздником Воскресения мы слушали слова Святого Писания. И так, в Великий Четверг мы сплотились над таинством Священства и Евхористии. В Великую Пятницу смотрим на себя, семью, свою Родину и весь мир через призму креста, на котором умер наш Спаситель. Великая Суббота — это большая радость, мы будем участвовать в таинстве освещения огня, пасхалия (символа Христа), и воды. После Святой литургии — освещение еды.

В этом году наш приход празднует Воскресение Христа после Святой Литургии Великой Субботы. Поздно вечером прославляем силу Воскресения.

Поздравляем всех читателей с этим Светлым Праздником. Пусть сила Воскресения Господа даст Вам силы для решения всех проблем в вашей жизни:
— будем светом в темноте;
— радостью в печали;
— надеждой в ожидании;
— водой во время жажды;
— хлебом во время голода;
— протянутой рукой в нужде.

Такова основа в человеке уже говорит о том, что его возлюбил Триединый Бог.

Пусть радость Воскресения Христа поселится в сердцах всех людей.

Христос Воскрес!

Воистину Воскрес!

С Божьим благословением к Вам настоятель костела г. Коссово и г. Ивацевичи отец Дарьюш БЛАЦИК.

XXX

Вялебныя Айцы, Дарагія Манахі, Манахіні і Браты Семінарысты! Любыя ў Госпадзе Браты і Сёстры! Шаноўныя Сябры!

Міласэрны Бог дазваляе нам урачыста сьвяткаваць першае сьвята Пасхі Гасподняй у Новым Тысячагоддзі і, што важна, сьвяты гэтыя ў гэтым годзе ўсе хрысьціяне аднначаюць разам. Увесь Хрысьціянскі сьвет згодна абвяшчае радасную навіну: "ХРЫСТОС УВАСКРОС — САПРАЎДЫ ЎВАСКРОС!"

Гэтае сумеснае сьвяткаваньне Вялікадня павінна яшчэ больш паглыбіць і ўмацаваць дух прымірэньня і братэрства паміж хрысьціянамі ў нашай Бацькаўшчыне — Беларусі. Уваскрасеньне Хрыстова мусіць стаць для нас усіх крыніцай новай, жывой надзеі і новай сілы ў складаньні хрысьціянскага сьведчаньня.

У гэты сьвяточны час ад усяго сэрца мы прагнем разам сьпяваць:

Хрыстос — мая Сіла,
Бог і Госпад,
пачэсная Царква
дастойна пяе і кліча,
спаўняючы сьвята
з чыстым роздумам
у гонар Госпада.
(Канон Пасхі, песьня 4).

У гэтыя сьвяточныя дні з глыбіні сэрца голасна абвесьцім сьвету, што Ўваскрослы Хрыстос — наша надзея і крыніца новага жыцьця.

З пастырскім блаславеньнем ды вялікодным вітаньнем

Архімандрыт Сяргей (Гаек), Апостальскі візітатар для грэка-католікаў Беларусі.

ЧАС РЭСПУБЛІКІ

Экспорт мяса выгоден

Белорусские производители и экспортеры мяса и мясных изделий должны сегодня усилить работу с российскими потребителями.

Такое мнение в беседе с корреспондентом БелаПАН высказал первый заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия Беларуси Александр Прокопов. По его словам, в связи с запретом на ввоз мясной продукции из стран Западной Европы российские потребители обращают все большее внимание на Беларусь. В свою очередь, белорусские производители от этого могут только лишь выиграть. В последние две недели цены на мясо на российском рынке выросли, и часть белорусских поставщиков смогла оперативно отреагировать на ситуацию. Как считает Александр Прокопов, сегодня необходимо слаженнее взаимодействовать с российской стороной, и решению таких вопросов должен способствовать визит в Минск вице-премьера правительства России, министра сельского хозяйства Алексея Гордеева, намеченный на 12-14 апреля.

О кредитах селу

О выполнении основных показателей денежно-кредитной политики, намеченных на первый квартал, доложил председатель правления Национального банка Беларуси Петр Прокопович, которого глава государства 10 апреля принял с отчетом.

По информации Петра Прокоповича, решены вопросы, касающиеся устойчивости курса белорусского рубля, финансовой стабилизации, кредитования правительства и экономики, в том числе кредитования агропромышленного комплекса. В этом году кредиты селу предоставляются напрямую коммерческими банками. Сегодня ими уже выделено 40 миллиардов рублей на финансирование весенне-полевых работ. Президент подчеркнул, что эта работа должна продолжаться.

Выборы и государственность

"Выборы президента страны - это неотъемлемая часть нашей общей работы по построению эффективного демократического правового государства," - заявил, выступая 10 апреля с ежегодным посланием к парламенту, Александр Лукашенко.

— Нужно поднимать в глазах общественности важность этого мероприятия, связанного с функционированием всей системы государственной власти. Системы, действующей на основе высшего уровня легитимности - волеизъявления народа". От результатов предстоящих выборов, по его словам, "во многом будет зависеть судьба белорусской государственности, стратегия развития белорусского общества". Поэтому, указал президент, "сегодня как никогда ранее необходимо единство в обществе".

Дифтерия наступает

В 2000 году в Минске отмечен резкий рост заболеваемости дифтерией - острым инфекционным заболеванием верхних дыхательных путей, которое чревато летальным исходом при развитии осложнений.

Как заявила 10 апреля на пресс-конференции главный эпидемиолог комитета по здравоохранению Мингорисполкома Алла Рожденная, по сравнению с 1999 годом произошел рост заболеваемости в 4,7 раза. Из 52 случаев заболевания по стране 32 зафиксировано в Минске. При общереспубликанском показателе заболеваемости 0,52 на 100 тысяч населения в Минске он составил 1,88. Из четырех умерших от дифтерии двое - жители столицы, которые скончались вследствие развития миокардита (воспалительного заболевания сердечной мышцы). За три месяца нынешнего года дифтерией заболело уже шесть минчан (всего по республике - 11 человек).

Спортсменки отказались от контракта

В выездном составе белорусской сборной по пулевой стрельбе, направляющейся 13 апреля в Атланту, где стартует этап Кубка мира, нет бронзового призера Олимпиады в Сиднее Лолиты Евглевской и Юлии Синяк, там же занявшей 4-е место.

Как сообщил главный тренер сборной Александр Кедяров, эти две спортсменки после Олимпиады отказались продлить контракты с Министерством спорта и туризма и с тех пор ни в каких внутренних соревнованиях не участвовали. По всей вероятности 37-летняя Лолита Евглевская, не первый год проживающая в Австралии со своей семьей, решила всерьез обосноваться в этой стране.

Еще большей потерей для сборной станет молодая и опытная неоднократная чемпионка Европы, обладательница Кубка мира - 23-летняя Юлия Синяк, участвовавшая в дуэльной перестрелке за олимпийскую "бронзу" с Лолитой Евглевской. По информации БелаПАН, она намеревается перебраться в Россию.

(БелаПАН).

ЗАРАСТАЕ ГРЫЎДА...

Ці будзе хто чысціць раку?

Аляксандр ГОРБАЧ.

Так на некаторых участках выглядае рака Грыўда.

"Паглядзіце, як "перагароджана" водарасцямі наша Грыўда каля маста, што паміж Івацэвічамі і вёскай Халап'я. У тых "зарасніках" назбіралася шмат смецця, нейкія бутэлькі, нават пенапласт і г. д. Ці будзе хто чысціць раку?" — з такім пытаннем звярнуўся ў газету наш чытач Валерый Басалай з горада Івацэвічы.

На яго пытанне адказвае Лявонцій Уладзіміравіч Мяцечка, начальнік планава-тэхнічнага аддзела прадпрыемства меліярацыйных сістэм.

— У нашым раёне аж 3000 кіламетраў меліярацыйных каналаў, якія трэба падтрымліваць у належным стане. Але калі экалагічная служба райвыканкама звернецца да нас, знойдзе сродкі, то мы, зразумела, адклікнемся. Тым больш, што ў нас на "ўзбраенні" маецца чаротакасілка.

Але зразумейце і тое, што натуральныя вадаёмы патрабуюць, каб чалавек як можна менш умешваўся ў іх жыццядзейнасць.

Падрыхтаваў **Аляксандр ГОРБАЧ.**
г. Івацэвічы.

Правила знают...

БЕРЕЗА. 8 апреля в Березе состоялся 24-й районный слёт юных инспекторов дорожного движения. В нём приняли участие команды из 30 школ района. Призовые места по итогам слёта распределились следующим образом.

1-е место — Ястребельская СШ, 2-е место — Малечская СШ, 3-е место — Берёзовская СШ № 2. Следует отметить, что команда Ястребельской школы уже который год подряд занимает лидирующие места в подобных слётах. И это при том, что в школе обучается всего 64 ученика. В первую очередь в этом видится заслуга тренера Анатолия Мошко. В прошлом году команда Ястребельской школы заняла 2-е место в области, но, к огорчению ребят, приз за эту победу им до сих пор не вручили.

Следующий этап состязаний юных инспекторов пройдёт в г. Ивацевичи. В нём будут участвовать победители из Берёзовского, Ивацевичского, Барановичского и Пружанского районов. А в мае уже в Бресте состоится областной слёт.

Николай СИНКЕВИЧ.

Радзеюць рады абаронцаў

ІВАЦЭВІЧЫ. З кожным годам радзеюць рады абаронцаў нашай краіны. Гэта паказаў апошні прызыў у раёне. З 380 маладых людзей прызыўнога ўзросту адзін не з'явіўся на прызыўны ўчастак. Толькі 112 чалавек было накіравана ў войска, менш адной трэцяй. 140 юнакоў працягвае вучобу, 16 — атрымалі адтэрміноўку па сямейных абставінах. Трывожыць тое, што 69 маладых людзей былі прызнаны камісіяй непрыгоднымі да службы ў арміі, яшчэ 21 чалавек з'яўляецца часова непрыгодным. З 12 асуджаных восем могуць быць прызваны ў армію толькі па спецыяльным распараджэнні, а чатыром зусім нельга давяраць зброю з-за крымінальнага мінулага.

Такім чынам, звыш 20 працэнтаў прызыўнікоў у мірны час не сталі салдатамі. Асноўная прычына — сур'ёзныя хібы ў здароўі маладых людзей (сардэчнікі, гіпертонікі, хваробы ўнутраных органаў, псіхічныя расстройствы і г. д.).

Не сакрэт, што жабрацкае становішча нашага народа сур'ёзна адбіваецца на фізічным і маральным здароўі маладога пакалення.

Алесь СЯЛЮК.

Заинтересуем студентов

ПРУЖАНЫ. Местная молодёжная организация "Гражданский форум" проводит опрос студентов Пружанского агротехнического колледжа по вопросу изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь "Об образовании в Республике Беларусь", а именно той его части, которая касается распределения выпускников ПТУ, средне-специальных и высших учебных заведений. Предложение по внесению изменений и дополнений в Закон внес депутат Национального собрания Владимир Новосяд, согласно которому выпускники должны иметь возможность самостоятельно выбирать место работы после окончания учебного заведения.

"Гражданский форум" представляет возможность каждому заинтересованному студенту высказать свое "за" или "против" изменений, касающихся трудоустройства. Свои предложения можно высказать по телефону 8-232-2-00-40.

Юлия ТЕЛЬПУК.

Забойства ў Косаве

ІВАЦЭВІЧЫ. Гэта здарылася 6 красавіка надвячоркам на Косаўскай аўтазаправачнай станцыі. Невядомыя (а колькі іх было, пакуль што ніхто не ведае) забілі аператара аўтазапраўкі Ш., забралі грошы і зніклі.

Міліцыя вядзе пошук.

Мікалай ДЗМІТРУК.

Автоугоны

БАРАНОВИЧИ. Не думал, не гадал хозяин "Жигулей", которым 24 года от роду (г. н. 67-59 АС, зеленого цвета), что угонщик может позариться и на его авто. Тем более, средь бела дня — на три часа машина была оставлена возле дома по улице Курчатова.

Такая же участь постигла еще один "ВАЗ-2131", гораздо новее — 1996 года выпуска.

26 марта в промежутке с 17 до 20 часов был угнан вишневый "Пассат", г. н. 83-64 АС. А днём ранее из гаражного массива по ул. Фестивальной был украден еще один "ВАЗ". Но угонщик, видно, был слаб в вождении — врезался неподалёку в железобетонный забор и на месте происшествия был задержан. Будущее остальных угнанных машин туманно.

Галина СТРОЦКАЯ.

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

Цэны на рынках нашага рэгіёну па стану на 11.04.2001 г. (у руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны	Драгічын
Свініна	2500	2500—4000	2500—3600	2500—3500	2600—3000
Сала салёнае	1900—2500	1800—2800	2500	2600	2700
Алей (1 л)	750—1000	700—1100	750—950	800—1100	900—1200
Яйкі	900—1000	800—1000	800	800	1000—1050
Малако (3 л)	600	600	600	600	630—670
Шпроты	450	400—420	450—480	400—450	570
Масла сметанк.	1900	2000	2000	2000	2000
Бульба	80—100	100—120	100	100—120	110—120
Цыбуля	200	220	250	200	245
Морква	200	200—300	180	180	190
Капуста	220	300	80—200	100—120	120
Памідоры	2200	1600—2000	2300	2300	1700—1800
Буракі	60—80	120—140	60—80	80	85
Мандарыны	1900—2300	2000—2200	2000	1800—2100	1900
Грэцкія арэхі	1800	2000	1500	1300—2100	1800
Яблыкі	400—650	450—800	400—600	420—500	450—550
Маянэз	250—450	240—420	250—420	240—450	350—520
Вінаград	3500—4000	3800—5000	4000	4500	4000—4700
Агуркі	1800	1200—1300	1300	1400	1400
Часнок	1600	1800	1000	1000	800—900
Лімоны	1400	1400—1600	1700	1450	1500
Апельсіны	1200—1400	1200—1300	1300	1200	1600
Бананы	1200—1500	1000—1200	1200	1450	1400
Гранаты	1900	1900	1800	1600—1800	1950
Грэчка	550—600	650	550—600	700	620
Макар. вырабы	520—600	500—560	550	500—600	670
Рыс	500—540	500—520	550	540	600
Манныя крупы	500	460	500	500	530
Проса	320—350	330	380	400	380—400
Цукар	580	600	600	600	600
Мёд	4.000	4.000	3.600	4.000	4.000-4.100

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	1310	1400	1330	1400	1350	1400	—	—	1350	1400
1 дойчмарка	590	600	580	610	580	610	—	—	587	610
1 рубель Расіі	43	—	44	46	44	49	—	—	46	49

МОЙ ВЗГЛЯД НА СИТУАЦИЮ В БЕЛАРУСИ

6 апреля с. г. в Женеве (столица Швейцарии) на сессии Комиссии ООН по правам человека состоялось обсуждение за круглым столом ситуации с правами человека в Беларуси, Судане и на Кубе. Цель круглого стола — увеличить интерес общественности к нарушениям прав человека в названных странах путём привлечения внимания к жертвам преследований. В обсуждении за круглым столом принимал участие и выступил с речью Владимир Кудинов, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, крупный предприниматель, осужденный в феврале 1997 года и выпущенный на свободу спустя четыре года, в феврале 2001 года. Его выступление (в сокращении) мы предлагаем вашему вниманию, уважаемые читатели.

Александр Горбач.

Владимир Кудинов вернулся в большую политику.

Начиная с 1994 года в нашей республике, с приходом к власти А. Лукашенко, остановился процесс развития демократических преобразований общества. Вместе с А. Лукашенко у власти находятся люди коммунистической идеологии, и, как следствие, в республике остановился процесс рыночного преобразования, осуществляется государственное регулирование экономики.

А. Лукашенко навязывает нашему народу строительство некоего мнимого, так называемого рыночного, социализма. За годы его правления уровень жизни граждан намного ухудшился. Сегодня большинство граждан в республике получает месячную заработную плату в размере 30-50 $ США, а пенсию — 20-30 $ США при ценах на многие социально важные продукты питания выше мировых. Мизерную заработную плату не всегда платят в положенный срок.

Власти не принимают должных мер для решения этой и других проблем. Более того, режим иногда напоминает крепостной. Так, исполнительная власть Пуховичского района Минской области своим распоряжением ввела в районе принудительные работы для граждан, проживающих в сельской местности. Власти запрещают руководителям предприятий и организаций принимать на работу сельских граждан без согласования с райисполкомом, а это ограничивает права граждан, гарантированные Конституцией Республики Беларусь и Трудовым Кодексом.

С первых дней прихода к власти президент А. Лукашенко начал подавлять демократию в республике, устанавливать режим личной власти. Сегодня Республика Беларусь — единственная в Европе страна, где президент издаёт законы, так называемые декреты по аналогу 1917 года, издаваемые Лениным. Президент назначает всех судей, в том числе и Конституционного суда. Вместе с коммунистами в российской Государственной Думе и сторонниками восстановления советской империи в руководстве России А. Лукашенко ведёт политику уничтожения независимости Республики Беларусь, называет своими врагами НАТО и США, а другом — бывшего президента Югославии Милошевича.

Не менее, если не более, чем демократию, А. Лукашенко не приемлет и частный бизнес и белорусских предпринимателей. Рыночные реформы, начатые в 90-х годах, не только остановлены. Идёт возврат к временам СССР. На предпринимателей, которые ведут политическую борьбу с А. Лукашенко или которые поддерживают оппозицию, фабрикуются уголовные дела, а подчинённые Президенту судьи отправляют их в тюрьмы.

К политическим, а не к уголовным делам отнесены правозащитными организациями, Госдепартаментом США, Советом Европы и ОБСЕ целый ряд судебных процессов, в том числе моё осуждение и моего коллеги-депутата-предпринимателя А. Климова (до настоящего времени находящегося в тюрьме), а так же дела депутата Верховного Совета В. Щукина, молодофронтовцев Шидловского и Лабковича, бывшего премьер-министра М. Чигиря и членов его семьи, руководителя ОРТ в Беларуси П. Шеремета, лидера социал-демократической партии Н. Статкевича и многих других граждан.

Я по сфабрикованному обвинению был осуждён на 7 лет лишения свободы. В тюрьме я находился 4 года, и только по призывам международных организаций, правительств США и европейских стран белорусские власти были вынуждены выпустить меня на свободу.

Сегодня Республика Беларусь занимает одно из первых мест в мире по количеству осужденных на 100 тыс. человек населения. Все белорусские тюрьмы переполнены, а условия содержания в них просто ужасающие. Да и что можно говорить об условиях нахождения в белорусских тюрьмах, когда на одного человека там приходится 1 м² жилой площади, когда питание не соответствует медицинским нормам, когда тюрьма является центром распространения заболеваний (таких, как туберкулёз). Во многих случаях власти лишают человека не только свободы, но и здоровья.

Сегодня в республике судебная система действует на подавление политической активности граждан. С каждым годом, с каждым месяцем увеличивается число граждан, пострадавших от режима. Уже отсчёт ведётся не десятками или сотнями, а тысячами. Граждан наказывают в административном и уголовном порядке только за то, что они выходят на уличные митинги и шествия, за то, что они протестуют против ухудшения уровня жизни, выражают недовольство правлением президента и правительства. Как пример грубого нарушения прав и свобод граждан необходимо отметить арест в г. Минске 25. 03. 2000 г. более 500 человек, в том числе 37 журналистов. Для устрашения людей власти ввели в город бронетехнику и водомёты, а арестованных вывозили в ангары, находящиеся в воинских частях.

Аналогичные действия властей по устрашению людей были и 25 марта текущего года в г. Минске. В город были введены спецподразделения войск МВД. Проводились аресты, в том числе подвергнуты административному аресту лидер БНФ В. Вячорка, председатель правозащитного центра "Весна" А. Беляцкий. Многие граждане подвергнуты административным штрафам в крупных размерах.

Необходимо отметить вопиющие факты пропажи в нашей республике видных политических лидеров. 8 мая 1999 года пропал бывший Министр МВД Ю. Захаренко, 16 сентября 1999 г. одновременно пропали депутат ВС РБ В. Гончар и предприниматель А. Красовский, а 7 июня 2000г. пропал телеоператор ОРТ Д. Завадский. На протяжении длительного времени действенных мер со стороны властей по розыску вышеуказанных граждан не предпринимается.

Текущий год является важным в истории нашей республики. В ближайшее время должны быть объявлены выборы президента, но уже сейчас чувствуется большое давление властей на лидеров оппозиционных партий, общественных и правозащитных организаций, на независимые средства массовой информации, на предполагаемых кандидатов на пост президента. Это уголовные дела на бывшего премьер-министра М. Чигиря и его семью, давление на профсоюзы и их лидера В. Гончарика, преследования депутата ВС РБ С. Домаша и бывшего министра обороны П. Козловского.

Сегодня нет поддержки большинства граждан президенту А. Лукашенко. Власти понимают, что честно выиграть выборы уже невозможно, поэтому всячески препятствуют организации действенного наблюдения за выборами. Об этом свидетельствуют и высказывания властей в адрес КНГ ОБСЕ в г. Минске и пресловутый декрет Президента №8, которым предусматривается контроль со стороны властей за поступлением безвозмездной помощи неправительственным организациям.

Владимир КУДИНОВ,
депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, бывший заключённый.

Бойкота не будет

На заседании Координационной рады демократических сил, состоявшемся в Минске 10 апреля, принято заявление о том, что распространяемые сведения о намерении КРДС бойкотировать президентскую кампанию не соответствуют действительности.

В документе говорится, что КРДС на сегодняшний день объединяет 68 политических партий, 6 региональных и коалиционных образований, а также многие общественные инициативы и организации, профсоюзы. "Выражая чувство озабоченности в связи с искажениями позиции КРДС или субъектов, входящих в КРДС, в проведении политических акций, а также в отношении предстоящих президентских выборов, нашедшими, в частности, отражение в отчете миссии КНГ ОБСЕ; напоминая о принятых решениях, направленных на подготовку и участие демократических сил в предстоящих президентских выборах, Координационная рада демократических сил отмечает, что все массовые политические акции проводятся на коалиционной основе с участием представителей всех субъектов КРДС без исключения. Еще осенью 2000 года рада однозначно высказалась за плановерную подготовку и участие в предстоящих президентских выборах. Заявления о якобы существующих намерениях КРДС бойкотировать президентскую избирательную кампанию не соответствуют действительности и опровергаются практической деятельностью КРДС", - говорится в заявлении.

"Чарнобыльскі шлях — 2001"

10 апреля в Мингорисполком подана заявка на проведение "Чарнобыльскага шляху - 2001". Первоначально члены оргкомитета мероприятия были настроены не подавать заявку. Однако на заседании Координационной рады демократических сил 10 апреля было решено подать заявку с просьбой разрешить 26 апреля с 17.00 до 19.30 проведение в Минске ряда мероприятий.

Согласно заявке, сбор участников должен начаться в 17 часов на площади Свободы. С 17.30 до 18.30 там же намечено проведение акции "Час печали", в ходе которой состоится молебен в память о жертвах катастрофы. После этого, с 18.30 до 19.00, намечено шествие по улице Ленина, проспекту Скорины до площади Независимости. Затем участники акции предполагают передать в Дом правительства петицию о проблемах, вызванных аварией на Чернобыльской АЭС.

По предварительным оценкам, в "Чарнобыльскім шляху - 2001" должно принять участие до 10 тысяч человек. Мероприятия пройдут под лозунгами: "За Беларусь - дзеля будучыні", "Беларусі - жыць!".

На заседании КРДС был также разработан план мероприятий к 15-й годовщине катастрофы на Чернобыльской АЭС: конгресс "Мир после Чернобыля", круглый стол "Пути решения последствий чернобыльской катастрофы", ряд мероприятий под девизом "Беларусь жыве!", молебны в храмах и так далее.

Заявку подписали 26 человек, в том числе руководители БНФ - Вячеслав Сивчик, Виктор Ивашкевич, Алексей Ковалец, Объединенной гражданской партии - Александр Добровольский, Василий Шлындиков, Александр Соснов, Белорусской социал-демократической партии (Народная Грамада) - Алексей Король, председатель оргкомитета "Чарнобыльскага шляху" Иван Никитченко.

Геннадий БАРБАРИЧ.

В Беларусь направлен гуманитарный конвой из Франции

Гуманитарный конвой из Франции направлен в Беларусь. Торжественная церемония отправки груза состоялась 7 апреля.

Как сообщила БелаПАН пресс-служба МИД Беларуси, конвой организован крупной студенческой ассоциацией "Гуманитарная миссия "Интергранде-коль", объединяющей представителей 15 ведущих вузов Франции. Акция получила патронаж ЮНЕСКО и ее генерального директора Каиширо Мацуура и приурочена к 15-й годовщине аварии на Чернобыльской АЭС. Студенческая ассоциация уже во второй раз направляет в Беларусь гуманитарный конвой (первый раз подобная акция была проведена в апреле 2000 г.).

Гуманитарный конвой состоит из 26 микроавтобусов и одного грузового автомобиля с медикаментами, школьными принадлежностями, детскими игрушками для госпиталей и детских домов Брестской и Гомельской областей, а также французских учебников для вузов Минска.

Андрей ОСМОЛОВСКИЙ.

(По материалам БелаПАН).

ДЗЕ Ж ЯНЫ, ТЫЯ СТО ДОЛАРАЎ?

Колькі чакаць абяцанага?

Большасць з нас, канешне, ужо забылі тое, што сем гадоў назад абяцаў дэпутат ВС Аляксандр Лукашэнка, які тады іграўся да ўлады. Але, упэўнены, народ цудоўна памятае заяву, што прагучала паўгода назад: маўляў, у жніўні 2001 года работнікі бюджэтнай сферы будуць атрымліваць зарплату, роўную 100, 200, нават 500 долараў.

Сергей САМОХІН.

..А пакуль што лічым кожную капейку.

Заява тым больш запамінальная, што нарэшце нам, беларусам, якія баяцца матэматыкі, паабяцалі штосьці канкрэтнае, а не абцякальныя фармуліроўкі, кшталту "Я запушчу заводы!", "Я остановлю преступность".

На календары ўжо красавік, засталося чатыры месяцы да жніўня. Колькі ж на дадзены момант атрымліваюць работнікі бюджэтнай сферы — ваенныя, настаўнікі, урачы, работнікі культуры? Нагадаем, што валютны курс сёння складае прыкладна 1300 рублёў за долар.

Як паведамілі нам у бухгалтэрыях аддзелаў культуры райвыканкамаў рэгіёну, сёння заробак бібліятэкара складае ад 44 да 54 тысяч на вёсцы (ад 33 да 41 долара) і ад 38.500 да 57.800 у горадзе (29-44 долары). Сельскі выкладчык музыкі атрымлівае 44—66 тысяч (33—50 долараў), гарадскі — 38.500—57.800 (29—44 долары), загадчыкі сельскіх клубных установ — 54—74 тысячы рублёў (41—56 "зялёных").

Як бачыце, работнікам культуры трэба заробак павялічыць у 2—3 разы, каб атрымалася запаветная сума.

Па словах бухгалтараў аддзелаў адукацыі нашага рэгіёну, настаўнік з вышэйшай адукацыяй (2 катэгорыя) мае стаўку 34900 рублёў, сельскі на 20 працэнтаў больш — 41880 рублёў. Дададзім сюды даплаты за класнае кіраўніцтва, праверку сшыткаў, стаж і г. д. і атрымаецца, што настаўнік, які мае нагрузку 18 гадзін у тыдзень, атрымлівае 50—65 тысяч рублёў у горадзе (38—50 у. а.), 60—75 (46—57 "зялёных") на вёсцы. Гэта, канешне, не самыя вялікія грошы, таму настаўнікі звычайна стараюцца ўзяць больш гадзін.

У бухгалтэрыях медыцынскіх установ нам паведамілі аб заробках урачоў і медсясцёр.

Стаўка ўрача сёння складае 37375 рублёў (без катэгорыі). Трэба адзначыць, што ў медыцыне маюць месца рознага тыпу даплаты — за шкоднасць, стаж, начныя дзяжурствы і г. д. Таму ўрач сёння атрымлівае на рукі 80—100 тысяч рублёў (61—76 у. а.).

Стаўка медсястры — 28520 рублёў. Тут таксама маюць месца розныя даплаты, і заробак медсястры складае сёння 50—60 тысяч рублёў (38—46 долараў).

Такім чынам і медыкам, і педагогам трэба павялічыць зарплату ў два разы, каб абяцанне Лукашэнкі спраўдзілася.

У фінансавай часці адной з вайсковых часцей рэгіёну нам паведамілі аб тым, якія заробкі маюць ваеннаслужачыя. Малодшы афіцэрскі састаў (у званні лейтэнанта, да прыкладу) атрымлівае 100—115 тысяч рублёў (76—88 у. а.), прапаршчык — 80—100 тысяч рублёў (61—76 у. а.), звыштэрміновы — каля 80 тысяч (каля 60 "зялёных").

Такім чынам, ваенным таксама неабходна павялічыць зарплату, але, праўда, не так кардынальна: у 1,4—1,6 разоў.

Час не стаіць на месцы, не заўважыш, як настане той самы жнівень. І, думаецца, калі здарыцца (а гэта вельмі верагодна), што бюджэтнікі не ўбачаць вышэйзгаданага заробку, то ўлады, кіраўнік краіны хуценька знойдуць "вінаватых": нядбайных міністраў, "нячэсных" журналістаў, апазіцыю, блок НАТА, праціўнікаў аб'яднання. Сумна не будзе, шаноўны чытач.

Падрыхтаваў Аляксандр МІХАЛЕНКА.
г. Івацэвічы.

"Тюремное дело окаянное"

От тюрьмы и от сумы не зарекайся...

Когда-то, а если точнее, то сто лет назад, здесь были царские конюшни. Году эдак в 1928 это место по документам стало проходить как тюрьма. Тюрьмой по привычке его называют и сегодня. Но это — следственный изолятор (СИЗО) и здесь находятся люди, которых по закону мы не имеем права называть преступниками. По логике, их просто в силу определенных обстоятельств лишили свободы. И только.

Несколько веков назад Петр Первый сказал, что тюремное дело — окаянное, посему служить там должны люди добрые да веселые, и тем самым обозначил своеобразный моральный кодекс сотрудника столь специфичного учреждения.

— А мы никогда и не брали людей с улицы, — подчеркивает заместитель начальника изолятора Николай Константинович Бугаев. — Всегда обращали внимание на моральные, деловые и физические качества будущего сотрудника, смотрели аттестаты, чтоб балл не ниже четырех был. А во главу угла ставили моральные и деловые качества.

Видимо, благодаря столь тщательному отбору кадров Барановичский СИЗО числится в разряде лучших, по итогам работы за прошлый год занял первое место по области. И тут должное в первую очередь надо отдать начальнику СИЗО Вячеславу Михайловичу БУЗЮКУ, человеку, знающему все тонкости столь сложной службы.

— Значит ли это, что порядки в изоляторе крутые и арестованные сидят, как мыши под метлой? И в СИЗО никогда не проникает ни спиртное, ни наркотики, а уж о женщинах и спрашивать боюсь? — выдыхаю свой вопрос и смотрю на выражение лица заместителя начальника по воспитательной работе. Лицо совершенно спокойно, потом его трогает легкая улыбка, дескать, дилетантский вопрос или обычная журналистская подковырка?

— Что касается перечисленных вами удовольствий, то никто из сотрудников даже за большие деньги на это не пойдет. А если бы вдруг и случилось такое, то мы знали бы об этом тут же. Сами же заключенные и доложат: почему ему принесли, а мне нет? А что касается сидения под метлой, то не требуем мы этого вовсе. Поймите, главная цель — не кара, а исправление! Здесь находятся такие же люди, как и мы, и надо им помочь вернуться к нормальной жизни. И это самое важное. Не без гордости могу сказать, что в последнее время у нас не было случаев применения спецсредств, а это значит, что исправительный процесс на уровне и недоработок с нашей стороны нет.

— Во сколько на воле обходится лечение сифилиса и гонореи? — спрашивает начальник медицинской службы СИЗО Михаил Васильевич Бондарь. — Да не меньше ста долларов. А у нас можно полечиться бесплатно. И нуждающихся в подобного рода лечении, увы, немало. Равно как и тех, кого приходится снимать "с белого коня" — алкогольного психоза. Для таких пациентов у нас оборудована специальная камера. Душевные хвори у нас лечит психолог, — уточняет Михаил Васильевич.

По части медицины остается только добавить, что СИЗО имеет свою палату в городской больнице, а в пределах республики есть отдельная больница для заключенных. Все как обычно, вот только решетки на окнах да охрана у дверей, чтоб помнили и мысли грешные гнали. Не в санатории, чай, находятся, а в местах лишения свободы.

Частые посетители в изоляторе и священнослужители православной и католической конфессий. Приходят с пасхальными куличами. Но не угощение главное в их визитах — они тоже помогают лечить заблудшие души.

..От тюрьмы и от сумы не зарекайся.

Галина СТРОЦКАЯ.
г. Барановичи.

Смяротнасць перавышае нараджальнасць

Беларускія ўлады крыкліва заяўляюць аб тым, што жыццё народа з году ў год паляпшаецца. Але гэтаму адразу перастаеш верыць, калі пазнаёмішся з дэмаграфічнай сітуацыяй у Драгічынскім раёне. Звернемся да лічбаў.

За апошнія дваццаць гадоў колькасць насельніцтва Драгічынскага раёна зменшылася на 9,2 тысячы чалавек, а за мінулы год — на 249 чалавек. Памерла 844 чалавекі, а нарадзілася 595.

Знізілася працаздольнасць жыцця людзей. Сёння ў жанчын яна складае 74 гады, у мужчын 63.

Вельмі хутка старэе вёска. З 34 тысяч чалавек, што жывуць у сельскай мясцовасці, 12,8 тысячы жыхароў з'яўляюцца пенсіянерамі. А сюды яшчэ трэба дадаць інвалідаў і дзяцей. Так што праблема рабочай сілы на вёсцы стаіць вельмі востра.

І яшчэ для параўнання. У раёне жыве 23,9 тысячы мужчын і 27,2 тысячы жанчын. Варта задумацца, што ж адбываецца?

Галіна АЛЯКСІЕВІЧ.
г. Драгічын.

Як вы ацэньваеце публічныя выступленні Аляксандра Лукашэнкі?

Адказвае моладзь горада Пружаны

Надзя: Я рэдка слухаю выступленні Лукашэнкі. Мне больш падабаецца Уладзімір Пуцін, ён больш абаяльны, інтэлегентны. У беларускага прэзідэнта адно жаданне: дабіцца яшчэ большай улады. Дый рэдка я ўключаю тое БТ. Нецікавы гэты канал.

ВІКТАР: Я яго мала слухаю. А калі і слухаю, то лаўлю сябе на думцы, што наш прэзідэнт спачатку гаворыць, а пасля думае аб тым, што ён гаворыць. Да таго ж груба і нетактычна размаўляе ён са сваімі падначаленымі. Сорамна слухаць часам.

ДЗЯНІС: Само "багацце" мовы і лексікону гэтага палітыка не можа выклікаць павагу. Да таго ж, часта заўважаю, гаворыць ён неканкрэтна і абцякальна. Вельмі непаважліва ставіцца да беларускай мовы, а сам не можа вывучыць хоць адну іншую.

ЮЛЯ: Палітыкай цікаўлюся, і мяне абурае тое, што беларускі прэзідэнт вельмі груба размаўляе з людзьмі, якія за яго значна старэйшыя і маюць пэўныя заслугі. Сам жа Лукашэнка калісьці быў старшынёй калгаса і, наколькі вядома, поспехаў аніякіх не меў...

АЛЕГ: Трэба аддаць яму належнае: ён цудоўна ведае электарат, які яго слухае. Ён кажа проста і груба, але не думаю, што гэта правільна. Мне даводзілася бываць на сустрэчах з Лукашэнкам. Трэба адзначыць, што ён умее кіраваць публікай, падладжвацца пад яе.

СВЯТЛАНА: Я стараюся не слухаць выступленні гэтага палітыка. Яны мне проста непрыемныя. Такія ж адносіны да прэзідэнцкіх выступленняў у большай часткі моладзі. Сярод маіх знаёмых таксама шмат такіх, якія даволі крытычна ацэньваюць аратарскія здольнасці прэзідэнта.

У народ хадзілі Аляксандр ГОРБАЧ, Юлія ЦЕЛЬПУК (фота).

ФЕРМЕРСТВА — ЦЯЖКАЯ ПРАЦА

Вёска Пярковічы. Фермерская гаспадарка "Дзінка".Другая палова сакавіка. Ідзе густы снег. Але фермер Канстанцін Ігнатавіч з сынам Сяргеем корпаецца ў двары. Тут уся іх тэхніка. Знаёмячыся, пытаюся ў Канстанціна Ігнатавіча:

— І ў непагадзь не сядзіцца ў хаце?

— Ужо за зіму насядзеліся. Будзе. Трэба рыхтавацца. Хутка, як кажуць, у поле.

— Колькі ж ў вас гэтага поля? Я маю на ўвазе прыгоднай ворнай зямлі?

— Можна сказаць, што нямнога. Трохі больш як трыццаць гектараў.

— З чаго ж усё пачалося? Чаму паявілася новая цяга да зямлі?

— Раней я працаваў у сельгастэхніцы, меў дзве спецыяльнасці — электразваршчыка і майстраналадчыка. На рабоце ў мяне ўсё было ў парадку, нават лічыўся ў перадавіках. Калі ў 90-х гадах у нашай арганізацыі шмат чаго распрадавалася, я набыў сабе трактар ЮМЗ, што стаяў нерухома пад плотам. Дома адрамантаваў яго. Скора паявіліся ў мяне плугі, культыватар, раздабыў сабе трактарны прычэп. А калі з'явілася ўсё патрэбнае для апрацоўкі зямлі, то ўзнікла неабходнасць у набыцці свайго ўчастка. Але ж гэта аказалася не вельмі простым пытаннем. У тыя гады выдзялялі ўчасткі жадаючым з нейкай аглядкай і не самую лепшую зямлю. Так атрымалася і са мной.

— І колькі, Канстанцін Ігнатавіч, атрымалі таго ж поля?

— Праўду кажацe, што поле, дый яшчэ пустое і засмечанае. Недалёка ад камбікормавага завода, усяго два гектары і 17 сотак. Раней там быў кар'ер, потым стаў сметнікам, завалілі яго і прапанавалі мне.

— Не страшна было брацца за работу?

— Шчыра кажучы, страшнавата. Але адступаць не прыходзілася, бо маглі падумаць, што пабаяўся. Усёй сям'ёй прыводзілі ў парадак той кавалак зямлі. Нагараваліся ўсе і зразумелі, да якой ступені безгаспадарчасці можна давесці зямлю-карміліцу, калі адносіцца да яе абыякава. Зразумелі мы і другое: іменна працавіты, нераўнадушны чалавек вяртае да жыцця закінутыя палеткі. Мы ўсе з дзяцінства працавалі на зямлі, таму той першы страх перамаглі і вырабілі той участак, як у сваім агародзе.

— А не ўзнікла жаданне адмовіцца ад такой зямлі?

— Можа, калі ў думках і паяўлялася штосьці падобнае, але ненадоўга. Была добрая злосць і намер давесці справу да канца, і мы гэта зрабілі. Улады паверылі нам, што можам мы быць сапраўднымі гаспадарамі на любой зямлі.

— Як жа суседзі, калгаснікі аднесліся, Канстанцін Ігнатавіч, да вашага выбару?

— Вельмі неадназначна. Многія проста ў вочы казалі, маўляў, навошта вам гэта. Ёсць калгас, ёсць там зямля, вось і працуйце, зарабляйце свой хлеб. Нават былі моманты нейкай нядобразычлівасці, быў выпадак, што ў двор прыходзілі красці салярку.

З гадамі мы трохі разжыліся. Да першага ўчастка выдзелілі нам яшчэ 30 гектараў зямлі ва ўрочышчы "Хмялёва", за восем кіламетраў ад нашай вёскі. Хацелася б бліжэй, але мясцовыя кіраўнікі добрай зямлі зноў пашкадавалі, а далі такую, як казаў адзін мясцовы жыхар, дзе і мох не вырасце. Зноў давялося вырабляць, завозіць угнаенні, словам, працаваць да сёмага поту. І ўсё гэта на вачах у сваіх жа вяскоўцаў. Іх погляды на фермерства, прызнацца, паступова сталі змяняцца.

— І ў які бок?

— Вядома, у лепшы. А пасля таго, як мы набылі яшчэ адзін трактар, збожжавы камбайн, іншую тэхніку, а справы ў мясцовым калгасе пагаршаліся, то вяскоўцы пачалі звяртацца за дапамогай да нас, ахвотней пачалі дапамагаць і нам. Такое ўзаемаразуменне і ўзаемадапамога, вядома, на карысць абодвум бакам.

Фермер К. І. Шэндзер (другі злева) са сваёй сям'ёй.

— Разумею, што такія дружалюбныя адносіны не маглі не адбіцца на выніках вашай працы, Канстанцін Ігнатавіч. Як вы самі ацэньваеце іх?

— Кожны, хто працуе на зямлі, па-свойму ацэньвае свой уклад, свае здабыткі. Мы працуем на зямлі ўсёй сям'ёй. І жонка Таццяна Іванаўна, і сын Сяргей ніколі не баяліся цяжкасцей, таму і аддача ёсць. Праўда, не настолькі, каб разбагацець. Затраты ў нас вялікія і на тэхніку, і на ўгнаенні, і на насенне. Здараецца, што ні капейкі не застаецца сабе. Тады выручае жонка, бо яна працуе ў Пярковіцкай санаторнай школе, і яе пастаянны заробак часта выручае ўсю сям'ю.

— Якім жа культурам вы аддаеце перавагу?

— Спярша сеялі і садзілі ўсяго патрохі, а потым вырашылі, так сказаць, спецыялізавацца. На першым месцы зерневыя культуры, у прыватнасці, пшаніца. У нас ёсць свой камбайн. Сеям 4 гектары цукровых буракоў. Працаёмкая і далікатная гэта культура. Шмат увагі патрабуе. Летась мы з кожнага гектара сабралі па 500 цэнтнераў салодкіх карэнняў. Гэта амаль у два разы больш, чым у калгасах раёна. Па дагаворы здавалі дзяржаве. Выгада ёсць.

На новым участку пасадзілі шэсць сотак клубніцы. Добра яны там растуць, але адбою няма то ад дзетвары, то ад мясцовых дармаедаў, то проста ад несумленных людзей. Як правіла, злодзеі чужое не шкадуюць, больш топчуць, чым збіраюць ягады. Прадавалі іх, вазілі нават у Мінск.

— Мне сказалі, што вы, Канстанцін Ігнатавіч, спрабавалі і сад вырасціць там, ва ўрочышчы "Хмялёва"?

